

## Яўген СКІБСКІ

* * *

*самая цяжкая праца —*
*рэдактар аддзела паэзіі*
*ад сівой даўніны*
*да нашых змрочных часоў*
*ходзяць легенды*
*паданні (і байкі)*
*пра суровых паэтаў*
*апантаных*
*да небяспечнасці,*
*якія ламаюць звычаі*
*стэрэатыпы*
*традыцыі*
*веру*
*і нават галовы*

*я чуў на ўласныя вушы*
*словы паэтаў*
*расповеды іх*
*падобныя да гісторый*
*пра чорнага альпініста*
*калі енк пераходзіць ва ультрагук*
*калі па пакоі*
*лётаюць вазы келіхі і часопісы*
*калі сэрца выскоквае з горла*
*ад крыві*
*якая раптам*
*становіцца кіпенем*
*бо ў тэксце змянілі слова*

*калі іх такіх не было б*
*я б першы сказаў*
*што паэзіі больш няма*
*прышліце кветкі*
*паэтам усім і паэткам*
*і можна спакойна піць*

*але пакуль яны ёсць*
*пакуль яны*
*нервы душу і сэрца рвуць*
*рэдактару аддзела паэзіі*

*а найперш — сабе*
*жыццё мае сэнс*

*але*
*памятайце*
*пра рэдактара аддзела паэзіі*
*якому на жаль*
*ніхто не дасць малака*
*за шкоднасць умоў працы*

*а можа*
*таму і не дадуць*
*што па ўсмешцы*
*ў яго на твары*
*па вачах*
*якія бачылі глыбіні і дно*
*палёты ў невядомае*
*і ледзяны змрок вакууму*
*і засталіся жывымі*
*ўсім зразумела:*
*рэдактар аддзела паэзіі —*
*самая лепшая праца*